*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



## ТЭМА 13. АЛЯКСЕЙ ДУДАРАЎ.

1. Падрыхтуйце **мультымедыйную прэзентацыю** пра жыццёвы і творчы шлях Аляксея Дударава.

2. Падрыхтуйце **конкурс афіш** да твораў Аляксея Дударава (работа ў групах).

3. Адкажыце на пытанні **віктарыны** «Пазнай героя» па творы А. Дударава «Вечар», што вывучаўся ў VIII класе:

1. «Раз'ехаліся ўсе... А калодзеж жывы павінен быць... З яго чэрпаць трэба, каб вада ў зямлю не пайшла, каб не застаялася, каб свежай была...» (Мульцік)
2. «Сонцу, як людаед, моліцца, вада ў яго ну не проста вада, а жывая...» (Гастрыт пра Мульціка).
3. «Душа ў чалавека баліць. На зямлі нарадзіўся, вырас, а рук да гэтай зямліцы ніводнага разу не прыклаў...» (Мульцік пра Гастрыта).
4. «Што добра чалавеку, калі ў яго куточак родны на зямлі ёсць, дзе некалі босым па расе бегаў... Добра, значыць, што цябе чакаюць і помняць заўжды...» (Ганна)
5. «Трое дзетак у партызанах з голаду памерлі, старэйшы сын «без весці», Піліп вярнуўся кулямі ды асколкамі начынены, два месяцы пажыў... Віцька адзін застаўся, дык і ў яго жыццё наперакасяк пайшло...» (Мульцік Гастрыту пра Ганну).
6. «І блін наш на цябе падобны, і бохан хлеба... Ты – наша... Але і астатнія твае дзеці... І іх любіць трэба.. Любі, не стамляйся...» (Мульцік сонцу).
7. «Але мы з табой яшчэ толькі таму і жывём, што кожную раніцу па ваду ў гэты калодзеж ходзім, на сотках сваіх калупаемся... З зямлёй за доўгі век зрасліся, душой-сэрцам увайшлі ў яе...» (Мульцік Ганне).

4. **Наведайце спектакль па п’есе Аляксея Дударава і напішыце водгук на спектакль**. Водгук – выказванне ўражанняў, дзе аўтар дзеліцца сваімі думкамі аб творы, пры гэтым не ставіць мэту ўсебакова ахарактарызаваць змест і мастацкую структуру. Водгук пішацца ад імя першай асобы.

Кампазіцыйная схема

1. Уступ (тэзіс)
2. Доказ (аргументы)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Вывады

5. Падрыхтуйце **паведамленне** на тэму «Вобразы гістарычных асоб у сучаснай беларускай драматургіі».

6. Зрабіце **пастаноўку** сцэны (на ваш выбар) адной з п'ес Аляксея Дударава.

7. Звярніцеся да аднакласнікаў з **просьбай ад імя гістарычнай асобы** – князя Вітаўта, Францыска Скарыны, Еўфрасінні Полацкай і інш.

8. Падрыхтуйце **паведамленне** пра значэнне творчасці Аляксея Дударава, выкарыстоўваючы наступны план:

1. *Месца ў развіцці нацыянальнай літаратуры.*
2. *Месца ў развіцці сусветнай літаратуры.*
3. *Асноўныя праблемы эпохі і адносіны да іх.*
4. *Традыцыі і наватарства ў галіне:*

*а) ідэй;*
*б) тэматыкі, праблематыкі;*
*в) творчага метаду і стылю;*
*г) жанру.*

5. *Ацэнка творчасці крытыкамі і сучаснікамі.*

9. Падрыхтуйце **літаратурна-музычную кампазіцыю** «Ад прадзедаў спакон вякоў…» (па п'есах А. Дударава).

10. **Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Аляксея Дударава:**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ